# Belarus live

## Newsletter

12.02.2007

Вялікі розгалас у краіне і за межамі выклікала інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі агенцыі "Ройтэрс", дадзенае 6 лютага. Беларускі афіцыйны лідэр прызнаў памылковасьць ранейшай вонкавай палітыкі, фактычна зарыентаванай толькі на Расею. "Мы стаялі на адной назе, а мусім стаяць на дзьвюх. Мы знаходзімся між Захадам ды Расеяй. Мы — мост між Расеяй і Захадам", — мэтафарычна выказаўся Лукашэнка.

Разам з тым, назіральнікі зьвяртаюць увагу на тое, што ён адкінуў патрабаваньні Эўропы датычна дэмакратызацыі ўнутранага жыцьця, назваўшы іх разбуральнымі для створанай ў краіне палітычнай сыстэмы.

Аналітыкі лічаць: фактычна Лукашэнка хоча згуляць на трывогах Захаду датычна надзейнасьці даставак энэрганосьбітаў, трываласьці транзыту ўвогуле, нелегальнай міграцыі і г.д., прапануючы паслугі Беларусі ў вырашэньні гэтых праблемаў. Ён спадзяецца такім чынам атрымаць прызнаньне, не ахвяруючы аўтарытарнай уладай. Яшчэ адна мэта ягоных рэвэрансаў у бок Захаду — падштурхнуць Расею да саступак, выціснуць зь яе яшчэ трохі прэфэрэнцыяў, зазначаюць аналітыкі.

Такім чынам, рэзюмуюць яны, апошнія заявы Лукашэнкі на тэму замежнай палітыкі маюць у значнай ступені піяраўскі характар. На думку экспэртаў і апазыцыі, у гэтай сытуацыі Захаду важна выявіць прынцыповасьць.

Тым часам урад дэкляруе намер атрымаць сёлета $1-1,5 млрд. вонкавых крэдытаў, а таксама стварыць лепшыя ўмовы для залучэньня ў краіну замежных капіталаў.

"Дагэтуль нашыя праблемы вырашаліся збольшага за кошт унутраных крыніц... Каб пакрысе ператрываць рэзкае падаражэньне энэрганосьбітаў, нам сёлета спатрэбіцца замежная падтрымка ў выглядзе прывабліваньня вонкавых рэсурсаў", — заявіў днямі міністар фінансаў Мікалай Корбут.


### ПАЛІТЫКА
- Беларускі прэзыдэнт даў інтэрвію агенцтву "Reuters"
- Прэзыдэнт Ірану наведае Беларусь

### АФІЦЫЙНА
- Аляксандр Лукашэнка абверг сьцьверджаньні расейскіх палітыкаў, быццам бы беларуская эканоміка датуецца РФ
- Расея заплаціць за арэнду земляў, занятых пад сыстэму транзыту энэргарэсурсаў

### АПАЗЫЦЫЯ
- Аляксандар Мілінкевіч выступіць сёньня ў Эўрапарлямэнце
- 4 лютага ў Менску былі арыштаваныя каля 30 актывістаў незарэгістраванай моладзевай арганізацыі "Малады Фронт"
- Зьміцер Хведарук і Алег Корбан выйшлі на волю

### ЭКАНОМІКА
- Беларусь спадзяецца на замежныя інвэстыцыі
- Да 2014 году ў Беларусі будзе свая АЭС
- Уначы сьвятло будзе каштаваць утрая таньней

### ГРАМАДЗТВА
- Рэктараў прыватных ВНУ ў Беларусі будзе прызначаць міністар адукацыі
- У Вільні распачаў дзейнасьць Беларускі дом правоў чалавека
- Саюз беларускіх пісьменьнікаў падасьць у суд на Міністэрства адукацыі

### КУЛЬТУРА
- Адбылася прэзэнтацыя фільму "На перадавой Перамогі"
- Швэдзкая графіка ў Менску

Фінансісты лічаць: паколькі вонкавы дзяржаўны доўг невялікі (блізу $850 млн. пры ВУП $37 млрд.), шанцы на атрыманьне крэдытаў даволі высокія. Гаворка ідзе не аб дзяржаўных, а аб сындыкаваных (syndicated) крэдытах.

Разам з тым, на думку экспэртаў, інвэстары пойдуць у краіну толькі тады, калі адбудуцца рынкавыя рэформы.

Тым часам урадоўцы гавораць найперш аб мадэрнізацыі вытворчасьці, дывэрсыфікацыі паставак энэрганосьбітаў, энэргазьберажэньні.

На прэсавай канфэрэнцыі 5 лютага кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч заявіў пра намер выйсьці ў пэрспэктыве на паказчыкі Канады што да энэргаёмістасьці ВУП. То бок, выдаткоўваць 0,2 т умоўнага паліва на $1 тыс. ВУП (цяпер гэты паказчык складае ў Беларусі 0,46 т).
Са слоў Мясьніковіча, Канцэпцыя энэргетычнай бясьпекі Беларусі пераглядаецца на карысьць пашырэньня базы ўласных паліўна-энэргетычных рэсурсаў. Гаворка ідзе, у прыватнасьці, пра выкарыстаньне бурага вугалю.

Вялікія надзеі ўскладае кіраўніцтва краіны і на пабудову АЭС. На гэтым тыдні афіцыйныя крыніцы паведамілі дэталі пляну разьвіцьця атамнай энэргетыкі. Будаўніцтва АЭС вырашана пачаць у 2008 годзе. Першы блёк плянуецца ўвесьці ў эксплуатацыю ў 2013 - 2014 гадах, другі — да 2015 года. Іх сумарная магутнасьць складзе 1 тыс. МВт. Да 2025 года намечана пабудаваць яшчэ два блёкі.
Зараз энэргабалянс краіны складае 34 млн. т умоўнага паліва (доля імпартных энэргарэсурсаў — каля 85%). АЭС магутнасьцю 2 000 МВт дазволіць выпрацаваць эквівалент 4-4,5 млн. т умоўнага паліва.
У 2007 годзе Беларусь павінна выбраць стратэгічнага партнэра для рэалізацыі праекту, пачаць перагаворы з пастаўніком тэхналёгій і абсталяваньня, адзначаюць крыніцы ў Акадэміі навук. Там лічаць, што давядзецца выбіраць найхутчэй што між францускім і расейскім варыянтамі.

На думку аглядальнікаў, выбар падрадчыка — заходняга ці расейскага — у значнай ступені будзе сымбалізаваць і геапалітычны выбар Беларусі. Так, замова ў французаў — гэта прагматычны масток на Захад (атрыманьне крэдытаў, разьвіцьцё кантактаў у цэлым шэрагу сфэраў, пашырэньне зоны даверу і г.д.). Калі ж выберуць расейскі праект, дык толькі ўзмоцніцца залежнасьць ад краіны, якую ў Мінску ўжо наўпрост называюць "энэргетычнай імпэрыяй".

Але разьвіцьцё кантактаў з Захадам, на думку аналітыкаў, стрымліваецца праз страх кіроўных вярхоў падпасьці пад рынкава-дэмакратычны уплыў, які можа пакрысе падтачыць падмурак рэжыму.
Апазыцыйны лідэр Аляксандар Мілінкевіч, адзначаюць палітолягі, зрабіў днямі ўдалы піяр-ход, прапанаваўшы ў адмысловым лісце афіцыйнаму кіраўніку краіны супрацу з апазыцыяй дзеля інтэграцыі ў Эўропу. Разам з тым, аналітыкі лічаць малаімаверным, што ўлада пойдзе на падключэньне сваіх апанэнтаў да меркаванага дыялёгу з Захадам.

Ва ўсякім разе, апошні тыдзень быў адзначаны новымі рэпрэсіямі супраць апазыцыі. У прыватнасьці, адбылося масавае затрыманьне актывістаў моладзевай арганізацыі "Малады фронт". Дваім зь іх пагражае суд паводле крымінальнага артыкулу аб дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі (пры тым што ўсе спробы зарэгістраваць яе былі марнымі). ■

# ПАЛІТЫКА

## Беларускі прэзыдэнт даў інтэрвію агенцтву "Reuters"

**Інтэрвію Аляксандра Лукашэнкі агенцтву "Reuters" не пакідае надзеі на зьмены ў стылі кіраваньня краінай.** Аднак ён падкрэсьліў, што хацеў бы захаваць добрыя адносіны як з Захадам, так і Ўсходам — піша польскі партал www.bialorus.pl.

Гаворачы пра Эўрапейскі Зьвяз, Лукашэнка заявіў, што Беларусь заўсёды жадала сядзець за тым жа сталом, але гэта немагчыма ў такой атмасфэры, якая цяпер існуе. Зьвяз замарозіў замежныя рахункі беларускіх палітыкаў і ўвёў уязныя санкцыі пасьля фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў вясной мінулага году.

У сваю чаргу Расея рэзка павысіла цану на энэрганосьбіты. Лукашэнка параўнаў палітыку Расеі да палітыкі ЗША, бо ёсьць у ёй "нейкі імпэрскі стыль". Аднак беларускі прэзыдэнт старанна ўстрымваўся ад словаў крытыкі ў адрас Уладзіміра Пуціна.

У сваю чаргу Аляксандар Мілінкевіч лічыць, што адмовай ад прапановаў аб’яднанай Эўропы Лукашэнка ставіць Беларусь на мяжу самаізаляцыі, а беларускі народ выракае на пэрспэктыву зьбядненьня. Пра гэта адзін з лідэраў аб’яднаных дэмакратычных сілаў заявіў у інтэрвію інфармацыйнаму агенцтву "Reuters".

"Я ўпэўнены, што ўлада да канца яшчэ не адчула ўсёй небясьпекі, якая пагражае ў сёньняшняй сытуацыі беларускай эканоміцы. Яна думае, што існуючая камандная сыстэма кіраваньня эканомікай яшчэ мае рэзэрвы й рэсурсы. Гэта памылка, якая будзе дорага каштаваць беларусам. Пытаньне ў тым, на якія крокі ўлада сёньня гатовая пайсьці, каб выправіць сытуацыю.

Я не хачу, каб у краіне здарыўся абвал эканомікі. Я катэгарычна супраць эканамічных санкцый у дачыненьні Беларусі". сказаў Аляксандар Мілінкевіч у інтэрвію.

## Прэзыдэнт Ірану наведае Беларусь

**Як паведаміў пасол Ісламскай рэспублікі Іран у Беларусі Абдольхамід Фэкры, Махмуд Ахмадзінэжад можа прыбыць з афіцыйным візытам у Менск у наступным месяцы.**

Пасол Ірану ў Менску адзначыў, што падчас візыту прэзыдэнта Ірану ў Беларусь будудзе падпісаны шэраг важных двухбаковых дамоваў, якія датычацца рэалізацыі сумесных праектаў.
Іран прадаставіў Беларусі нафтавае поле для разьведкі і здабычы нафты. На дадзены момант у Беларусі працуе сумеснае прадпрыемства па зборцы іранскіх аўтамабіляў "Саманд". Таксама Іран выказаў гатоўнасьць удзелу ў стварэньні беларускай АЭС.

# АФІЦЫЙНА

## Аляксандр Лукашэнка абверг сьцьверджаньні расейскіх палітыкаў, быццам бы беларуская эканоміка датуецца РФ

**Прэзыдэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрвію галоўнаму рэдактару расейскай фэдэральнай газэты "Завтра".**

Падчас размовы закраналіся пытаньні зьнешняй палітыкі Беларусі, узаемаадносін з Расеяй і цэн на энэрганосьбіты, супрацоўніцтва з эўрапейскімі краінамі, рэакцыі народаў Беларусі й Расеі на гэтак званы нафтагазавы канфлікт.

На пытаньне, якія пэрспэктывы далейшых беларуска-расейскіх адносін на фоне нядаўніх падзей, прэзыдэнт заўважыў, што ў цяперашняй сытуацыі "ўсё залежыць ад расейскага кіраўніцтва".
Аляксандр Лукашэнка на канкрэтных фактах паказаў некарэктнасьць разьлікаў расейскага боку, згодна зь якімі беларуская эканоміка быццам бы датуецца Расеяй.

Закранаючы скачок цэн на энэрганосьбіты для Беларусі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: "Гэта былі прамыя ўказаньні прэзыдэнта Расеі". Прэзыдэнт Беларусі яшчэ раз пацьвердзіў шматвэктарны характар зьнешняй палітыкі краіны, дзе ёсьць месца супрацоўніцтву не з адной

дзяржавай, а з многімі — і на Усходзе, і на Захадзе, паведамляе агенцтва БЕЛТА.

Расея заплаціць за арэнду земляў, занятых пад сыстэму транзыту энэргарэсурсаў

Расейскі бок будзе плаціць 5 мільёнаў даляраў у год за арэнду беларускіх лясных земляў, занятых пад сыстэмы транзыту энэргарэсурсаў.

Пра гэта паведаміў старшыня Дзяржаўнага камітэту па маёмасьці Беларусі Рыгор Кузьняцоў. Акрамя гэтых 5 мільёнаў, яшчэ 3 млн. будуць плаціць беларускія суб'екты ў выглядзе падатку за зямлю.
Такім чынам, гадавы аб'ём плацяжоў за арэнду зямлі, на якой разьмешчаны лінейныя аб'екты транспартных сыстэм транзыту энэргарэсурсаў, складзе ў год каля 8 млн. даляраў, паведамляе агенцтва "Интэрфакс-Запад".

# АПАЗЫЦЫЯ

## Аляксандар Мілінкевіч выступіць сёньня ў Эўрапарлямэнце

**8 лютага распачаўся аднадзённы візыт Аляксандра Мілінкевіча ў Брусэль.**

У межах Дня Беларусі ў Эўрапарлямэнце, арганізаванага фракцыяй Эўрапейскай народнай партыі — Эўрапейскія дэмакраты, лідэр дэмакратычных сіл правядзе таксама шэраг важных сустрэч і перамоў з кіраўніцтвам Эўрапарлямэнту.

Тэмамі перамоў стануць актуальныя пытаньні палітыкі ЭЗ у дачыненьні да Беларусі, а таксама пэрспэктывы аднаўленьня эканамічнага й палітычнага супрацоўніцтва аб’яднанай Эўропы з Беларусьсю. Заплянаваныя сустрэчы са старшынём Камітэта па міжнародных справах Эўрапарлямэнта Яцкам Сарыюшам-Вольскім, а таксама лідэрам парлямэнцкай фракцыі Эўрапейскай народнай партыі — Эўрапейскія дэмакраты (EPP-ED) Жозэфам Даўлам (Joseph Daul).

Падчас Дня Беларусі ў Эўрапарлямэнце адбудзецца шырокае абмеркаваньне палітычнай сытуацыі ў Беларусі й верагодных сцэнароў яе разьвіцьця. Удзел у абмеркаваньні возьмуць дэпутаты Эўрапарлямэнту, прадстаўнікі Рады ЭЗ, ПАРЭ, Дзярждэпартамэнту ЗША.

## Арыштаваныя каля 30 актывістаў незарэгістраванай моладзевай арганізацыі "Малады Фронт"

**Арышт адбыўся падчас паседжаньня Цэнтральнай Рады арганізацыі.**

Каля 16.30 паводле беларускага часу байцы спэцназу ўварваліся ў прыватную кватэру ў цэнтры Менску, дзе адбывалася сустрэча.

Усе затрыманыя былі перавезеныя ў Савецкі РАУС сталіцы, дзе адносна некаторых актывістаў былі складзеныя пратаколы. Непаўнагадовыя "маладафронтаўцы" былі адпушчаныя без складаньня пратаколу. Двух затрыманых, Зьміцера Хведарука й Яўгена Скрабутана, дапытвалі супрацоўнікі КДБ і патрабавалі прызнаньня ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі.

Каля 24.00 гадзіны ўсе затрыманыя, акрамя Зьміцера Хведарука, былі адпушчаныя. Пазьней працягваліся перартрусы ў кватэрах некаторых затрыманых. Падчас перартрусу ва ўласнай кватэры, падчас сьвяткаваньня Дня народзінаў, быў арыштаваны й маладафронтавец Алег Корбан. Ягонае месцазнаходжаньне дагэтуль невядомае.

Паводле словаў Івана Шылы, салігорскага актывіста МФ, міліцыянты не зьбівалі затрыманых і паводзілі сябе досыць карэктна. Падчас перартрусу яны прад’явілі адпаведную санкцыю.

Сёньня ў судзе Савецкага раёну адбудуцца суды над актывістамі "Маладога Фронту". Паводле артыкулу 193 арт. Крымінальнага кодэксу (Дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) на паўтара году быў асуджаны лідэр "Маладога Фронту" Зьміцер Дашкевіч.

## Зьміцер Хведарук і Алег Корбан выйшлі на волю

**Арыштаваныя ў нядзелю актывісты "Маладога фронту" Зьміцер Хведарук і Алег Корбан учора а 19.30 выйшлі на волю. Яны былі выпушчаныя пад падпіску аб нявыезьдзе.**

Чальцы моладзевай арганізацыі маюць статус падазраваных у справе дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь прадугледжвае турэмнае зьняволеньне

паводле арт. 193 нават да некалькіх гадоў.

На працягу 10 дзён сьледзтва мае прадставіць хлапцам абвінавачаньні па дадзенай справе.

На думку Сяргея Скрабца, у Аляксандра Казуліна ў калёніі няма магчымасьці правільна выйсьці з галадоўкі

Траўля Аляксандра Казуліна ў калёніі працягваецца. "Мы павінны зрабіць усё магчымае, каб ён выйшаў з турмы. Гэта адзіны выхад. Інакш яго затравяць" — мяркуе былы вязень калёніі Віцьба-3 Сяргей Скрабец. І дадае, што траўля вязьня пачалася адразу пасьля прыезду Казуліна ў калёнію. Першае пакараньне ён атрымаў за тое, што хадзіў у красоўках, яшчэ перад тым, як атрымаў турэмны абутак. Другое пакараньне было дадзена вязьню за тое, што ён быццам бы зьняважыў афіцэра — паведамляе прэс-служба АГП. На думку Скрабца, адміністрацыя калёнія атрымлівае адпаведныя ўказаньні зьверху — ад міністра ўнутраных спраў, альбо яшчэ вышэй.

Адвакат Ігар Рынкевіч адзначае, што калі падчас апошніх 10 дзён галадоўкі Казулін знаходзіўся пры сьмерці, адміністрацыя турмы яго "абхажывала". Але цяпер, калі лекары заявілі, што няма пагрозы для яго жыцьця, у адносінах да Аляксандра Казуліна прымяняюць "мэханізм пэнітэнцыярнай сацыялізацыі".

Былы кандыдат у прэзыдэнты атрымаў 5,5 гадоў турмы за арганізацыю пратэстаў. У калёніі ён галадаў 53 дні, каб зьвярнуць увагу міжнароднай грамадзкасьці на праблемы палітычных вязьняў у Беларусі.

# ЭКАНОМІКА

## Беларусь спадзяецца на замежныя інвэстыцыі

**Беларускія ўлады гатовыя дазволіць замежныя капіталаўкладаньні ў любой форме.**

Пра гэта інфармацыйнаму агенцтву Ройтэр заявіў міністар фінансаў Беларусі Мікалай Корбут.

У мэтах мадэрнізацыі эканомікі беларускія ўлады гатовыя дазволіць інвэставаць у Беларусь замежным фірмам. Міністар фінансаў Міхаіл Корбут удакладніў, што ўмовы павінны быць карысныя для абодвух бакоў. Ён таксама пацьвердзіў, што паступовы пераход на рынкавыя адносіны з Расеяй змусіць кіраўніцтва краіны правесьці эканамічныя пераўтварэньні.

"Праз 5 год у нас будзе іншая эканоміка. Яна прыстасуецца да новых умоваў, якія будуць ёй пастаўленыя", – сказаў міністар фінансаў.

Таксама Міхаіл Корбут паведаміў, што ў гэтым годзе Беларусь плянуе ўзяць крэдыт у замежных банках на суму каля 1 млрд. даляраў каб кампэнсаваць кошты на расейскія энэрганосьбіты.

У той жа момант міністар М. Корбут выказаў спадзяваньне, што павышэньне коштаў энэргарэсурсаў не выкліча запавольваньня тэмпаў эканамічнага разьвіцьця краіны.

## Да 2014 году ў Беларусі будзе свая АЭС

**Ужо ў наступным годзе распачнецца будаўніцтва першай беларускай атамнай электрастанцыі.**

Пра гэта паведаміў старшыня прэзыдыюму Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясьніковіч.

У дадзены момант адбываюцца размовы з прадстаўнікамі МАГАТЭ, а таксама фірмамі, якія будуць браць удзел у стварэньні станцыі. Свае прапановы ўжо даслалі Францыя, Расея, а таксама некалькі іншых краінаў. Старшыня Акадэміі навук не выключае, што будаўніцтвам АЭС будуць займацца дзьве розныя кампаніі. Будаўніцтва АЭС магутнасьцю ў 2 тыс. МВт патрабуе інвэстыцыяў у памеры 2.5-3 млрд. даляраў. Міхаіл Мясьніковіч не выключае магчымасьці прадстаўленьня крэдыту Сусьветным банкам, а таксама ўдзелу ў праекце замежных сродкаў.

Першы блёк Беларускай АЭС павінен запрацаваць у 2014 годзе, ягоная магутнасьць складзе 1 тыс. МВт. Да 2020 году плянуецца ўвесьці ў эксплюатацыю чарговы блёк АЭС.

## Уначы сьвятло будзе каштаваць утрая таньней

**Беларускі ўрад вырашыў, што ўдзень, увечары й ўначы электрычнасьць будзе каштаваць па-рознаму.**

Каб вызначыць кошт на электраэнэргію, суткі падзялілі на зоны мінімальных і максымальных нагрузак.

1 кілават-гадзіна таннай электраэнэргіі будзе каштаваць каля 75 рублёў, а дарагая — больш за 220, амаль утрая даражэй.

Таньнейшай электрычнасьць будзе па выхадных і сьвятах.

Самым дарагім узімку будзе час з 8 да 11 і з 17 да 20 гадзінаў.

Такім чынам, удзень і ўначы, а таксама ў выхадныя й сьвяты тарыфы будуць зьніжаныя ў паўтара разы ў параўнаньні зь цяперашнімі. А вось у астатні час яны павялічацца ўдвая.

Каб плаціць за электрычнасць па новых правілах, давядзецца купіць за свой кошт электронны шматтарыфны лічыльнік. Каштуе ён прыкладна 50—70 даляраў.

## Новы спосаб эканоміі энэрганосьбітаў

**Яшчэ ў 2007 годзе беларускія вяскоўцы змогуць набыць новыя цеплагенэратары.**

Вучоныя Акадэміі навук Беларусі распрацавалі новыя мадэлі цеплагенэратараў для сельскай гаспадаркі, якія працуюць на саломе, адкідах ад торфу й дровах. Навукоўцы мяркуюць, што дзякуючы распрацаванай тэхналёгіі ўдасца значна ашчадзіць сродкі пры высокіх коштах на прыродны газ і вадкае паліва. Пры гэтым гаворка йдзе пра эканомію нават у некалькі соцень разоў.

А. Лукашэнка яшчэ ў мінулым месяцы заклікаў урад прымаць меры па эканоміі энэргарэсурсаў, паставіўшы гэтае пытаньне падстваі нацыянальнай бясьпекі.

# ГРАМАДЗТВА

## Рэктараў прыватных ВНУ ў Беларусі будзе прызначаць міністар адукацыі

**Рэктараў прыватных ВНУ ў Беларусі будзе прызначаць міністар адукацыі. Такая норма закладзена ў праект закона "Аб вышэйшай адукацыі".**

Нагадаем, што на сёньняшні дзень у Беларусі існуе 12 прыватных вышэйшых навучальных установаў, іх рэктараў прызначаюць іх заснавальнікі.

Паводле словаў кіраўніка пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі Уладзіміра Здановіча, ва ўзьнікненьні гэтай пастановы вінаватыя самі рэктары, якія, нібыта, "скампрамэтавалі сыстэму вышэйшай прыватнай адукацыі".

Аднак ліквідаваць прыватныя ВНУ ўлады не зьбіраюцца, сьцьвярджае Здановіч.

У Вільні распачаў дзейнасьць Беларускі дом правоў чалавека

Паводле словаў аднаго з заснавальнікаў Беларускага дому правоў чалавека Сяргея Дубаўца, сюды будзе паступаць і аналізавацца інфармацыя аб парушэньні правоў і свабодаў у Беларусі.

У згаданай установе будуць праводзіцца сэмінары й канфэрэнцыі датычныя пэўным выпадкам. Як паведаміў С. Дубавец, арганізацыю некалькі разоў спрабавалі зарэгістраваць у Менску, але ў сувязі з падыходам беларускіх уладаў да правоў чалавека, было вырашана зарэгістраваць арганізацыю менавіта ў бліжэйшай да Менску сталіцы. На мяжы паміж нашымі краінамі чыняцца бясконцыя зьдзекі над праваабаронцамі — гаворыць сяргей Дубавец, — гэта паралізуе рух на кантрольна-прапускных пунктах, дадае нязручнасьці грамадзянам.

Арганізацыя ў Летуве будзе дзейнічаць да таго часу, пакуль у Беларусі не адбудуцца кардынальныя зьмены са свабодаю й правамі чалавека, пакуль не пачне дзейнічаць Канстытуцыя й законы.

## Саюз беларускіх пісьменьнікаў падасьць у суд на Міністэрства адукацыі

**Найстарэйшае пісьменьніцкае аб’яднаньне Беларусі мае намер праз суд дабівацца скасаваньня забароны на сустрэчу з чытачамі для чальцоў саюзу.**

СБП будзе дабівацца пра суд прызнаньня незаконнасьці дзеяньняў міністра адукацыі Аляксандра Радзькова. Паводле сьведчаньняў саміх пісьменьнікаў, для наладжаньня сустрэчы з чытачамі ад выкладчыкаў навучальных установаў краіны патрабуюць пісьмовай згоды ад нядаўна створанага Саюзу пісьменьнікаў

Беларусі.

Старшыня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч ужо зьвяртаўся з лістом да міністра адукацыі з прапановаю скасаваць пастановы аб забароне творчых сустрэчаў, але А. Радзькоў не адказаў на прапановы А. Пашкевіча.

Саюз беларускіх пісьменьнікаў быў заснаваны ў 1934 годзе класікамі беларускай літаратуры Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Танкам і іншымі. У розныя гады яго чальцамі зьяўляліся Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Іван Шамякін, Уладзімер Караткевіч. Зараз Саюз пісьменьнікаў налічвае каля 550 сяброў. У мінулым годзе арганізацыя была пазбаўленая свайго памяшканьня ў Доме Літаратара. Зараз сядзіба саюзу месьціцца ў Вільні.

# КУЛЬТУРА

## Адбылася прэзэнтацыя фільму "На передавой Перамогі"

**У Менску прайшла прэзэнтацыя дакумэнтальнага фільму "На перадавой Перамогі". Ён прысьвечаны ўсім палітвязьням Беларусі.**

Паводле словаў кіраўніка юрыдычнай службы экс-кандыдат ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна, праваабаронцы Алега Воўчака, большую частку фільма складаюць аматарскія здымкі, хроніка, фота-матэрыялы, дакумэнты грамадзкай камісіі "Свабоду Казуліну й іншым палітвязьням!".

"Аказалася, што людзі зусім ня ведаюць, за што, па якой прычыне сядзіць у турме Казулін, — кажа Воўчак. — Таму зьявілася жаданьне прынесьці такі фільм у кожную кватэру".

Бліжэйшым часам фільм зьявіцца ў інтэрнэце й будзе даступны для прагляду й капіяваньня.

## Швэдзкая графіка ў Менску

**З 6 па 25 лютага ў музэі Марка Шагала ў Віцебску адбудзецца выстава швэдзкай графікі "Праз традыцыю ў будучыню". Ў выставе будуць прадстаўленыя працы 16 мастакоў-графікаў са Швэцыі.**

Швэдзкі інстытут яшчэ ўлетку сабраў працы для згаданай выставы. Падстaвай для гэтай выставы стаўся афіцыйны візыт караля й каралевы Швэцыі ў Славенію ў 2004 годзе.

У рамках выставы адбудзецца таксама сэрыя мастэр-клясаў швэдзкіх мастакоў-графікаў для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтва.

Арганізатарам экспазыцыі зьяўляецца аддзел амбасады Швэцыі ў Менску пры падтрымцы Швэдзкага інстытуту.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фарма-ваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейска моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Што-тыднёвую рассылку на ангельскай, нямецкай, францускай, польскай, беларускай, расейскай ды ўкраінскай мовах можна замовіць на сайце.